**МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ**

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

9 снежня 2009 г.
№ 40 (192)

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# НОВЫ СВЕРЖАНЬ ЧАКАЕ...

***Прайшло больш за год з таго часу, калі маё мястэчка Новы Свержань (Стаўбцоўскі раён) адзначыла прыгожую дату — 580 летаў і зімаў сваёй жыццёвай дарогі. Надоўга запомніцца той спякотны жнівеньскі дзень, музыка аркестра, радасныя твары прыхарошаных землякоў, шэсце вялікай калонай па галоўнай вуліцы з прыпынкамі ля гістарычных будынкаў, спевы талентавітага свержанскага хору...***

*А яшчэ што? А нічога. Прайшліся па вёсцы з удзелам старшыні Стаўбцоўскага райсавета і... разышліся. Ніякага, так бы мовіць, матэрыяльнага следу не засталося. Між тым, Новы Свержань — самае даўняе паселішча раёна, якое ўзнікла як першы рачны порт на Нёмане. Мае больш за 2 тысячы жыхароў, царкву св. Успення (XVI ст.), Петрапаўлаўскі касцёл (XVI ст.), сярэднюю школу, лесазавод са 100-гадовай гісторыяй. Чаму ж было не зрабіць нешта адметнае для гэтага практычна забытага сёння населенага пункта? Я ўжо не гавару пра асфальтаванне вуліц, пра тратуары на галоўнай магістралі, дзе вельмі інтэнсіўны транспартны рух, а людзі вымушаны хадзіць па праезнай палосе. Не кажу і пра высечку спрэс векавых дрэваў, замест якіх не пасаджаны новыя...*

*Дык, напэўна, можна хаця б зрабіць і паставіць у цэнтры памятны знак, які годна засведчыў бы вялікае мінулае мястэчка?*

*На мае прапановы, зробленыя яшчэ задоўга да юбілею, старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама У. Міська адказаў, што ў яго «абмежаваныя фінансавыя магчымасці» і параіў пашукаць спонсараў. Гэта зразумела, тым больш цяпер, ва ўмовах крызісу. Але я як чалавек, кроўна зацікаўлены ў захаванні памяці пра вялікую гісторыю Новага Свержаня, бачу, што прычына тут не толькі ў фінансах, дакладней, не столькі ў іх. Бо была ў мяне і яшчэ адна прапанова — драбная, што не вымагае асаблівых выдаткаў. Датычыла яна вяртання адной з вуліц гістарычнай назвы — Юрдзіка, якая гаворыць пра тое, што стагоддзі назад жылі тут «юрыдыкі» (насельнікі, не падначаленыя гаспадару паселішча). Назву гэтую скасавалі ў свой час, відаць, як незразумелую (таму непатрэбную) і замянілі на досыць банальную, але даступную масам Надзёманскую. Выкінулі частку гісторыі мястэчка (сённяшняй вёскі). Калі ж падчас згаданай вышэй святочнай урачыстасці я спытаў у старшыні сельскага Савета Г. Жаўруда, чаму ўсё ж не адновіць назву Юрдзіка, то пачуў у адказ сакраментальнае: няма грошай.*

*Яшчэ 5 гадоў таму я надрукаваў на гэту тэму нататкі ў раённай газеце («Ёсць такая вуліца — Юрдзіка»). Няўжо за 5 гадоў не знайшлося дробных сродкаў на аднаўленне гістарычнай справядлівасці? Можа, усё ж старажытная назва вуліцы вернецца на сваё законнае месца?*

**Аляксей ПЯТКЕВІЧ,**
**прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.**

## ЖЫВЕ ТАКІ ДОКТАР

**Сяргей Малікаў, урач Баранавіцкага анкалагічнага дыспансэра, спаў. Яго разбудзілі неадназначныя званкі ў дзверы, але калі гаспадар падняўся, то ўбачыў, што ў кватэру ўваходзяць двое.**

Невядомыя кінуліся наўцёкі, а Малікаў за імі. Аднаго злодзея ён затрымаў, а другога крыху пазней арыштавалі міліцыянеры. Рабаўнікамі, як высветлілася, былі гастралёры з Ліды. Яны спрабавалі напярэдадні залезці ў кватэру па вул. Жукава, але толькі сапсавалі замок.

За свой учынак урач атрымаў грамату і грашовую прэмію.

— Больш бы нам такіх дактароў! — кажуць у Баранавіцкім ГАУС.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# «СЯДЗЯЧАЯ» ПРАЦА

## У сталіцы створана першая дзяржаўная служба сядзелак



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Памятаю, як тры гады таму, якраз пад Новы год, мне патэлефанавала знаёмая. Тацяне было не да свята. Яна абівала парогі медыцынскіх і сацыяльных устаноў, каб хоць на нейкі час уладкаваць свайго паралізаванага бацьку. Пыталася, ці не магу я неяк паспрыяць ёй, бо там, куды яна звярталася, або просяць запісацца ў чаргу і пачакаць, пакуль вызваліцца месца, або ўвогуле не бяруць ляжачых.**

**А там, дзе бяруць, заламваюць за месяц знаходжання такія цэны, што ёй, педагогу са стажам, і трохмесячнай зарплаты не хопіць, каб разлічыцца.**

**— Ды і што мне з таго месяца, нават калі я знайду грошы? Бацьку патрэбны пастаянны догляд, а я ўжо і так паўгода разрываюся паміж ім і працай.**

Тацяна была ў роспачы. Тады ў нашай размове ўпершыню ўсплыло слова «сядзелка». Я параіла ёй пашукаць па аб'явах людзей, якія аказваюць адпаведныя паслугі. Высветлілася, што і гэтыя шляхі Тацянай пройдзены: за гадзіну догляду «такога хворага» прыватныя сядзелкі патрабуюць 6 долараў і вышэй. А вось у дзяржаўнай сацыяльнай структуры падобныя паслугі ўвогуле не прадугледжаны...

Тады я доўга не магла зразумець: чаму? Чаму там, дзе дзяржава магла б узяць гэтую літаральна «з падлогі», прыклаўшы мінімум намаганняў, яна не робіць гэтага? І навошта аддае такую неабходную і запатрабаваную паслугу, як догляд ляжачых хворых, на водкуп камерцыйным структурам? Між тым, наладзіўшы службу адпаведных паслуг у дзяржаўным сектары, можна было б зрабіць іх больш таннымі, а значыць, і больш даступнымі. І ў дадатак, зарабіць грошы ў дзяржаўную кішэню. Не шмат, але ўсё ж...

У падобным становішчы апынулася не адна Тацяна, а дзясяткі (калі не сотні) людзей з не надта высокім узроўнем даходаў, пастаўленых перад жорсткім выбарам: або звальняцца з працы і даглядаць хворага, жывучы на яго пенсію, або працаваць выключна «на сядзелку»...

Два гады таму ў сваякоў цяжкахворых людзей нарэшце з'явілася прымальная альтэрнатыва, а разам з ёю і надзея на вырашэнне сваёй праблемы. У лістападзе 2007 года пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна сталіцы была арганізавана першая дзяржаўная служба сядзелак, якая да гэтага часу з'яўляецца практычна адзінай не толькі ў Мінску, але і ў краіне.

— Спачатку гэты кірунак вяла я сама. Але паступова колькасць нашых кліентаў пачала расці і з'явілася неабходнасць у асобным спецыялісце, — расказвае мне загадчыца аддзялення тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання Марыя Німяровіч. — «Раскрутку» новай справы пачыналі з арганізацыйна-рэкламнай працы. Прычым, арганізацыйная частка займала львіную долю падрыхтоўчага працэсу, паколькі на рэкламную кампанію катастрафічна не хапала грошай (якія ў гарадскі бюджэт пад гэта ніхто папярэдне не закладваў). Звярнуліся са сваёй інфармацыяй у грамадскія арганізацыі, у паліклінікі, бальніцы і аптэкі горада Мінска: маўляў, аказваем паслугі сядзелак. У гарадскіх рэкламных выданнях размясцілі [illegible] некалькі сціплых абвестак накшталт «запрашаем сядзелак на працу» і ўжо ў 2008 годзе паставілі, як гаворыцца, справу на паток.

**Сядзелка абслугоўвае розныя сем'і, у кожнай з якіх свой лад жыцця і свае «шкілеты ў шафе».**

Паслугі сядзелкі, зразумела, платныя, паколькі не ўваходзяць у Пералік бясплатных агульнадаступных сацыяльных паслуг, якімі забяспечваюць грамадзян сацыяльныя ўстановы. У адпаведнасці з тарыфамі, зацверджанымі Мінскім гарвыканкамам, адна гадзіна працы сядзелкі каштуе 5240 рублёў. У начны час, а таксама ў выхадныя і святочныя дні тарыфы павышаюцца да 6080 рублёў і 7430 рублёў адпаведна.

5240 рублёў — гэта намнога танней, чым у камерцыйных структурах. Там з 2 долары за гадзіну расцэначная «шкала» толькі пачынаецца. Прыватная сядзелка пагодзіцца на такі «мінімум» у тым выпадку, калі кліент не ляжачы, і ад яе спатрабуецца толькі пакарміць яго.

— А ў нас гэты тарыф аднолькавы для ўсіх выпадкаў — і адносна лёгкіх, і вельмі цяжкіх, — кажа Марыя Німяровіч.

Да таго ж, камерцыйныя структуры бяруць пэўную суму «зверху» за пасрэдніцтва, інакш кажучы, за падбор сядзелак. А ў тэрытарыяльным цэнтры гэта робіцца бясплатна.

У абавязкі сядзелкі, акрамя знаходжання побач з хворым, уваходзіць падаграванне ежы, кармленне, мыццё посуду, змена бялізны, памперсаў, вынас судна. Ёсць і дадатковыя паслугі, адносна якіх распрацаваныя і дадатковыя тарыфы. Напрыклад, прыгатаванне ежы, уборка памяшканняў, суправаджэнне хворага ў тую ці іншую ўстанову, дастаўка прадуктаў, гігіенічныя ванны... Тарыфы на дадатковыя паслугі распрацоўваліся непасрэдна тэрытарыяльным цэнтрам Першамайскага раёна, і яны, паверце, невысокія (скажам, уборка памяшкання, дзе знаходзіцца хворы, каштуе 2240 рублёў, гігіенічная ванна — 4600 рублёў).

— Хаця і гэтыя расцэнкі задавальняюць далёка не ўсіх, — уздыхае Марыя Іванаўна. — Кажуць, дарагавата. Але знізіць тарыфы мы не можам. З гэтай сумы нам неабходна заплаціць падаткі, якія складаюць амаль 30 працэнтаў, і нешта пакінуць на патрэбы і развіццё самога тэрытарыяльнага цэнтра — на пашырэнне той жа рэкламнай і інфармацыйнай дзейнасці, на канверты і паперу... У выніку на аплату 1 гадзіны працы сядзелкі застаецца ў сярэднім 2100 рублёў. Аплата ў нас, так бы мовіць, здзельная, і напрамую залежыць ад колькасці адпрацаваных гадзін. Напрыклад, за дзве гадзіны працы сядзелка атрымае 4200 рублёў, за чатыры — 8400 рублёў, за дзесяць гадзін — 21 000 рублёў... Гэта зусім нямнога.

Адсюль і складанасці, якія ўзнікаюць на этапе падбору працоўных «кадраў». З аднаго боку — невялікія заробкі і спецыфічная, часам цяжкая (і ў маральным, і ў фізічным плане) праца... З другога — высокія патрабаванні не толькі да якасці апошняй, а і да асабовых характарыстык самой сядзелкі.

— Убачыўшы нашы запрашэнні на працу, сюды спачатку пайшоў, мякка кажучы, своеасаблівы кантынгент з характэрнымі «слабасцямі», аматары выпіць, — расказвае Вольга Камісарава, якая з пачатку года курыруе службу сядзелак, адказвае за іх падбор і працуе з кліентамі. — Такім «кадрам» мы адмаўляем адразу. З астатнімі падоўгу гутарым, цікавімся іх сацыяльным статусам, адукацыяй, ладам жыцця, распытваем, дзе працавалі раней, ці працуюць у гэты момант (некаторыя прыходзяць сюды па дадатковы заробак). Падчас гутаркі неабходна атрымаць ад прэтэндэнткі максімум інфармацыі, каб зрабіць правільны вывад адносна яе прафпрыдатнасці і сумленнасці. Памыліцца мы не маем права, бо бяром на сябе адказнасць за кожную сядзелку, з якой заключаем дагавор. Між іншым, шмат якія кліенты давяраюць сядзелкам ключы ад кватэры, так што ўсё вельмі сур'ёзна.

Канчатковы прыём на працу адбываецца са згоды дырэктара тэрытарыяльнага цэнтра і толькі пасля правядзення пэўнага інструктажу. Па-першае, патэнцыйную сядзелку папярэджваюць аб спецыфіцы будучай працы і аб тым, што ёй давядзецца пастаянна сутыкацца з чужым болем і далёка не самым прыемным бокам чалавечага жыцця.

— Існуе і яшчэ адзін, вельмі важны, момант, — гаворыць Вольга Камісарава. — Сядзелка абавязаная строга захоўваць пэўную этыку паводзінаў. Яна абслугоўвае розныя сем'і, у кожнай з якіх свой лад жыцця і свае «шкілеты ў шафе». Важна, каб яна не ўмешвалася ні ў якія ўнутрысямейныя ўзаемаадносіны, не «дапамагала» вырашаць сямейна-бытавыя праблемы ці канфлікты, не задавала ніякіх пытанняў. Яе задача — дакладна выканаць свае абавязкі.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

ГОД РОДНАЙ ЗЯМЛІ

# ГРОШЫ НЕ ТОЛЬКІ ТРАЦЯЦЬ, АЛЕ І ЗАРАБЛЯЮЦЬ

## На Ваўкавысчыне адбыўся другі раённы злёт сельскага актыву

— На першым злёце, — расказвае старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Святлана Прэдка, — мы ўшаноўвалі старастаў, якія вызначыліся ў арганізацыі добраўпарадкавання населеных пунктаў. Сёлета ў сувязі з Годам роднай зямлі кола сельскіх актывістаў пашырылася, бо ў выкананні мерапрыемстваў, прымеркаваных да Года, удзельнічалі не толькі старэйшыны, але і члены выканкамаў сельскіх і пасялковых Саветаў, дэпутаты, кіраўнікі структурных падраздзяленняў, размешчаных на тэрыторыі сельсаветаў, жыхары населеных пунктаў.

Святлана Уладзіміраўна знаёміць з выніковай інфармацыяй па кожным сельсавеце. Гэта ўражвае. Пералік добрых спраў, напрыклад, у прыгарадным Ваўкавыскім сельсавеце займае аж дзве старонкі друкаванага тэксту. Так, у вёсцы Войткавічы заасфальтавалі дарогу, а ў Новых Хацькоўцах яе адрамантавалі. Знеслі пяць старых пустых дамоў, навялі парадак на двух міні-палігонах. Спілавалі каля 30 аварыйных дрэваў у вёсках, пасадзілі звыш 90 маладых і г.д.

Старшыня сельскага Савета Раман Шаціла як сапраўдны гаспадар на сваёй тэрыторыі арганізоўваў работу сумесна з СВК «Хацькоўцы» і «Няверавічы», ДРБУ-188, ЖГК, мясакамбінатам, структурнымі падраздзяленнямі раённага вузла паштовай сувязі, райспажыўтаварыства і іншымі. Нехта дапамог фінансава, а дзе і сельсавет рубель з бюджэту выкраіў.

Так, каб спілаваць тыя ж аварыйныя дрэвы, спатрэбілася 4,5 мільёна рублёў, каб правесці рэкультывацыю несанкцыянаванай пляцоўкі часовага складзіравання адходаў, — яшчэ 1,3 мільёна.

Дарэчы, грошы не толькі трацілі, але і зараблялі. На аўкцыёне прадалі два ўчасткі пад будаўніцтва жылых дамоў, і бюджэт сельсавета папоўніўся адразу на 7,5 мільёна рублёў. А ў Рэплеўскім сельсавеце на добраўпарадкаванне адной толькі цэнтральнай вёскі Рэпля спатрэбілася 112 мільёнаў рублёў. Грошы знайшліся ў бюджэце сельсавета.

Шмат зроблена і ў іншых сельсаветах раёна: Вярэйкаўскім і Шылавіцкім, Гнезнаўскім, Субацкім, а таксама ў Падароскім, Роскім і Краснасельскім пасялковых.

Уласныя падворкі афармілі сёлета ў вёсках так, што вачэй не адвесці. З малымі архітэктурнымі формамі, альтанкамі, кветнікамі. Найлепшыя з лепшых — а гэта гаспадары 34-х узорных сядзібаў — былі адзначаны Пісьмом-падзякай райсавета дэпутатаў, сельскія актывісты — граматамі райвыканкама, каштоўнымі падарункамі і грашовымі прэміямі сельскіх і пасялковых Саветаў.

Па агульным настроі прысутных адчувалася, што свята ім дaспадобы.

— Людзі цягнуцца да прыгожага, — упэўнена Святлана Прэдка. — Сёння нашы вёскі не параўнаць з тымі, якія былі некалькі гадоў таму. Прыемна, што сярод гаспадароў-пераможцаў конкурсу на лепшую сядзібу сёлета пабольшала моладзі. Значыць, вёска будзе жыць... Але гэта не значыць, што ў нас няма праблем. Жыццё не стаіць на месцы, і тое, чым ганарыліся ўчора, сёння, мякка кажучы, не дацягвае да сучаснай планкі.

Вось, напрыклад, Падароск. Хоць і набыў ён два гады таму статус аграгарадка, але работы па яго добраўпарадкаванні працягваюцца. Ад гасцей гэтага не хавалі — наадварот, паказалі ўсе сацыяльна-бытавыя і культурныя аб'екты, якія яшчэ падладзіць трэба. Працягваецца добраўпарадкаванне тэрыторыі каля будынка сельсавета, дзе размяшчаюцца і сельская бытоўка, і бібліятэка, і ашчадная каса. На цэнтральнай вуліцы ўстанаўліваецца новая бетонная агароджа. А ў старшыні Падароскага сельскага Савета Сяргея Дуброўскага свой «галаўны боль» — дарогі, якія пакуль не перададзены на баланс дарожных арганізацый. Парадокс: у вёсцы Сядзельнікі ДРБУ-188 абслугоўвае дарогу толькі... да паловы населенага пункту, а пра астатнюю частку клапоціцца сельскі Савет (дапамагае сельгаспрадпрыемства).

— Казаць, што ў населеных пунктах наведзены поўны парадак, — дапаўняе Святлана Прэдка, — яшчэ рана. Не ўсе дарогі пакуль перададзены на абслугоўванне дарожным арганізацыям. Узнікаюць часам праблемы з несанкцыянаванымі звалкамі. Гэта дадатковыя выдаткі, а грошай на ўсё ў сельсаветах не хапае.

А старшыня раённага выканаўчага камітэта Дзмітрый Голец падкрэсліў: нельга кіравацца ў працы толькі адным пэўным указам або ставіць кропку ў добраўпарадкаванні пасля завяршэння Года роднай зямлі. Год адыходзіць, але шмат спраў чакае наперадзе.

**Галіна РАМАНЧУК,**

*Ваўкавыскі раён.*

# Каб атрымаць, трэба ўкласці

**Віцебск у наступным годзе атрымае рэкорднае фінансаванне на навядзенне парадку, развіццё інфраструктуры, вырашэнне самых розных камунальных праблем.**

Як расказаў нашаму карэспандэнту **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ**, на гэтыя мэты з абласнога бюджэту плануецца выдзеліць каля 100 мільярдаў рублёў. Столькі ж выдаткуюць і з гарадскога бюджэту. (Для параўнання, сёлета патрацілі больш за 35 мільярдаў рублёў.) У ліку іншага аддадуць увагу і віцебскім дварам — створаць сучасныя зоны для паўнацэннага адпачынку з пляцоўкамі для гульняў, лядовымі каткамі і г.д. Даўно трэба перасяляць людзей з некалькіх сотняў дамоў з пячным ацяпленнем. Вялікія ўкладанні робяцца ў індустрыю забаў.

Дзе возьмуць грошы, тым больш у крызісны час, на ажыццяўленне ўсяго задуманага? Іх у Прыдзвінскім краі навучыліся зарабляць. Па напаўненні рэспубліканскага бюджэту паўночны рэгіён цяпер у лідарах. Паралельна лепш папаўняецца і мясцовы бюджэт.

Усё больш прадпрыемстваў працуюць з прыбыткам. Значыць, ёсць надзейная крыніца для збору падаткаў. У вобласці створана каля 6 тысяч новых працоўных месцаў. Адпаведна, дадаткова пераличваюцца падаходныя падаткі. Развіваецца вялікімі тэмпамі сфера паслуг. Значна больш стала кавярняў і рэстаранаў. Да новага года пасля капітальнага рамонту адчыніцца «Смаленскі рынак» — цяпер тут будуць гандляваць пад дахам, у цяпле. А ўвесь абноўлены рынак запрацуе летам наступнага года. Значныя інвестыцыі ў рэканструкцыю акупяцца хутка, бо тавараабарот гэтага рынка можна параўнаць з бюджэтамі некаторых раёнаў.

Наогул у рэгіёне па-іншаму дзейнічае гандаль. Калі тавары не рэалізуюцца доўгі час, іх вяртаюць вытворцам, і тыя распрацоўваюць новыя віды тавараў, якія змогуць эфектыўна прадавацца. Такую «каманду» даў асабіста губернатар. На інтэлект і лагістыку робіцца на Віцебшчыне «вялікая стаўка».

Прыбытак у Віцебску атрымліваюць і на «дробязях». Напрыклад, лодкі і катамараны, якія сёлета спецыяльна закупілі для «прагулак» па рацэ Віцьба, ужо сябе акупілі. Цяжка паверыць, што раней у горадзе трох рэк наогул нельга было ўзяць на пракат ні лодку, ні катамаран.

Губернатар Прыдзвінскага краю лічыць, што каля паловы свайго бюджэту Віцебск можа зарабляць на... перапрацоўцы смецця. Дадзена заданне пабудаваць новы палігон і на ім сучаснае прадпрыемства па перапрацоўцы смецця, якое павінна «ператварацца» ў грошы. Каб эфектыўна зарабляць на смецці, будзе вывучаны адпаведны вопыт Японіі, Германіі.

У новых мікрараёнах «Білева-1», які ўжо заселены, «Білева-2» і ў «Сакольніках» будуць жыць каля 120 тысяч чалавек. Паралельна тут ствараецца ўся неабходная інфраструктура, каб людзі не мелі ніякіх праблем з атрыманнем паслуг. Іх будуць аказваць, па самых сціплых падліках, не менш за 20 тысяч чалавек. Падаходныя падаткі ад іх — добрая крыніца папаўнення бюджэту. Як і падаткі арганізацый, фірмаў, дзе яны будуць працаваць.

Будаўніцтва новых мікрараёнаў і новых дамоў, як «лакаматыў», цягне за сабой развіццё прадпрыемстваў па вырабе розных прадукцыі — бытавой тэхнікі, тканін і г.д. Цяпер на Віцебшчыне вельмі актыўна будуюць жыллё, аб'екты грамадскага прызначэння, аднаўляюць дамы, якім дзясяткі гадоў. Каб будаваць, рэканструяваць усё высокімі тэмпамі, у вобласці не хапае 1,5 тысячы будаўнікоў. Але прыцягваць з іншых рэгіёнаў і з-за мяжы іх не будуць. Губернатар упэўнены, што паўночная вобласць самадастатковая, і грандыёзныя планы будуць ажыццяўляць самастойна.

Стратэгія мясцовых уладаў — каб зарабляць, трэба патраціцца. Адпаведна, чым больш укладзеш, тым больш атрымаеш.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

НЕАБЫЯКАВЫЯ ЛЮДЗІ

# ГРУПАВЫ ПАРТРЭТ У «ІНТЭР'ЕРЫ»

***«Як толькі я быў абраны старшынёй раённага Савета дэпутатаў, перада мной паўстала пытанне — як арганізаваць нашых старэйшын, дэпутатаў, з'яднаць іх у адзінае ядро і накіраваць агульныя намаганні на навядзенне парадку ў нашых населеных пунктах, — расказаў старшыня Уздзенскага раённага Савета дэпутатаў Міхаіл ЛАПОТКА. — Штогод мы праводзім конкурс на вызначэнне лепшага сельсавета і старэйшыны, пераможцы атрымліваюць дыпломы і прэміі. Аднак у раённага Савета нестае грошай, каб матэрыяльна заахвоціць усіх актыўных дэпутатаў і старэйшын (вартых узнагароды ў нас многа!). Мы прыйшлі да высновы, што самае лепшае выйсце — маральнае заахвочванне, якое цэніцца вышэй за грошы. У нашай раённай газеце мы зрабілі старонку для дэпутатаў і выбаршчыкаў «Улада мясцовая — справы дзяржаўныя», якая пачала выходзіць літаральна з першых дзён работы 25-га склікання. Там мы расказваем пра нашых дэпутатаў, старэйшын, старшынь сельвыканкамаў. У нас шмат актыўных людзей. Паверце, абы пра каго мы пісаць не будзем, бо людзі чытаюць раёнку, і яны нас адразу асудзілі б, калі б мы праз газету пахвалілі чалавека, які насамрэч гэтага не варты».***

Журналіст «МС» асабіста пазнаёміўся з некаторымі героямі тэматычнай старонкі і пераканаўся ў справядлівасці слоў старшыні райсавета.

...Анатоль Анатольевіч АНДРОН з вёскі Любячы — дэпутат Хатлянскага сельскага Савета. Працуе майстрам лесу ў Валяр'янаўскім лясніцтве. Не дзіўна, што да яго часта звяртаюцца з просьбай спілаваць аварыйныя дрэвы (у вёсках гэта вялікая праблема). У раёне сваёй вышкі няма, а Андрон абыходзіцца без яе. Не так даўно ён зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік і цяпер аказвае такія паслугі афіцыйна. «За «лёгкія» дрэвы я аплату не бяру, — тлумачыць дэпутат. — А калі цяжкая работа і ёсць канкрэтны заказчык (у сваяка на магіле спілаваць дрэва так, каб не пашкодзіць суседнія, ці ля хаты, каб правады і саму хату не закрануць) — тады за плату. Цана прымальная — яшчэ ні разу ніхто не адмовіўся. Без справы я ў найбліжэйшы час не застануся — у мяне чарга з заказчыкаў вялікая, а як індывідуальны прадпрымальнік я працую толькі па выхадных».



Анатоль АНДРОН.

Як дэпутат Анатоль Анатольевіч рэгулярна абходзіць неўладкаваныя сем'і, правярае, у якіх умовах знаходзяцца дзеткі. Дапамагае пажылым аднавяскоўцам дабрацца да бальніцы ў цэнтр. «У мяне аднаго ў вёсцы ёсць машына, — гаворыць народны абраннік. — Скажам, доктар прызначыў бабульцы прыём на 13.00, а аўтобус ідзе толькі зранку. Хто яе завязе? Вось яна і прыходзіць да мяне. Вязу. Там яна пабыла — назад прывёз... Да мяне прыходзяць з рознымі пытаннямі. Напрыклад, у кагосьці абарвала правады вулічнага асвятлення (сук упаў). Просяць мяне — патэлефануй у РЭС. Многія нават не ведаюць, куды звяртацца ў выпадку праблем. Ідуць да мяне».



Віталь БАРАДАЎКА.

Анатоль Анатольевіч — лесасек-віртуоз. Ён неаднойчы браў удзел у прафесійных спаборніцтвах як мясцовага, так і міжнароднага ўзроўню. Сёлета стаў чэмпіёнам Мінскай вобласці, летась заваяваў другое месца ў рэспубліцы. Неаднаразова станавіўся пераможцам Кубка Балтыкі ў Латвіі, прызёрам аналагічнага расійскага чэмпіянату, двойчы браў удзел у чэмпіянаце свету (у Эстоніі і Германіі). «Там у асноўным конкурсы звязаныя з прафесійнымі лесанарыхтоўкамі, — узгадвае майстар лесу, — з валкай дрэваў (за 15 метраў ад цябе ставяць калок, на які трэба «пакласці» ссечаны ствол), з абрэзкай галін, а таксама са зборкай-разборкай бензапілы на хуткасць. Самы лепшы свой вынік у гэтым спаборніцтве я паказаў у Германіі, калі здолеў справіцца з задачай (разабраць пілу, памяняць цэп і зноў сабраць) за 12,3 секунды. А на абрэзку 30 сукоў спатрэбілася 17 секунд». Такі высокі прафесіяналізм, на думку самога Анатоля Анатольевіча, абумоўлены ў першую чаргу вопытам і пастаяннымі трэніроўкамі, а таксама жаданнем перамагчы, дасягнуць большага.

Цікава, што нарадзіўся ён у Мінску, але вяртацца ў сталічныя «джунглі» з жалеза і бетону не збіраецца. Тут, у вёсцы, у яго дом, сям'я, праца. Па спецыяльнасці ён пчаляр, працаваў сталяром, ляснічым і ўжо прыкладна год з'яўляецца майстрам лесу.

Анатоль Анатольевіч — чалавек неабыякавы, яго хвалюе ўсё, што адбываецца ў вёсцы:

— Аграгарадкі — гэта добра, але паглядзіце, каго засяляюць у новыя дамкі? Часам — людзей невядомай нацыянальнасці, выпівак. Яны дрэнна працуюць, пачынаюць развальваць гаспадарку. Лепш за гэтыя грошы, што пайшлі на дамкі, пабудавалі б новыя малочнатаварныя фермы, далі добры заробак людзям. Чалавек бы сам прыехаў, узяў крэдыты і пабудаваў сабе жыллё.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# ГРУПАВЫ ПАРТРЭТ У «ІНТЭР'ЕРЫ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Сур'ёзнай праблемай у вёсцы, лічыць Анатоль Анатольевіч, з'яўляецца дрэнная якасць вады.

— Многія нашы людзі проста не ўсведамляюць, які вялікі ўплыў аказвае яна на арганізм. Мы самі больш чым на 80 працэнтаў складаемся з вады. Большасць хваробаў абумоўлена нізкай якасцю спажыванай вады, тымі шкоднымі хімічнымі спалучэннямі, якія ў ёй утрымліваюцца. У нас шэраг калодзежаў утрымлівае ваду, непрыдатную для ўжывання (санстанцыя прапануе мясцовым жыхарам спажываць бутляваную ваду). У некаторых аграгарадках водаправоды старыя, наскрозь пржавелыя. Там, дзе палажылі новыя пластыкавыя трубы, усё выдатна, але асноўная сістэма патрабуе замены. Трэба мяняць водаправоды, бурыць новую артэзіянскую свідравіну.

Дэпутат разумее, што на ўзроўні сельсавета ці раёна такую праблему не вырашыць (неабходна падтрымка «зверху»), але спадзяецца, што яго голас пачуюць.

...Віталь Мікалаевіч БАРАДАЎКА — ваенны пенсіянер, старэйшына вёскі Суткі Камянкоўскага сельсавета. За гады службы атрымаў 5 урадавых узнагарод, знакі «Ветэран Чырванасцяжнага Паўночнага флоту» і «Ветэран падводнага атамахода». Служыў на атамным ракетаносцы К-33 (атамнай падлодцы першага пакалення, «сястры» К-19). Хадзіў у аўтаномкі (баявыя дзяжурствы) у Атлантыку і ў Індыйскі акіян. «Перад тым, як пайсці ў аўтаномку, неабходна было «абкатаць» асабісты састаў у надводным палажэнні, каб праверыць, як «адчуваюць хвалю» сухапутныя маракі, — дзеліцца ўспамінамі пенсіянер. — На падлодках служыла шмат выхадцаў з Беларусі, Украіны. З 2800 прызыўнікоў медкамісія адабрала толькі 200. Як цяпер адбіраюць у касманаўты, так тады нас адбіралі для службы на падлодцы. І цэнтрыфуга ў нас была, і баракамера. Я праслужыў у званні мічмана Расійскага флоту няпоўныя 15 гадоў і ўсе гэтыя 15 гадоў у асноўным хадзіў у мора, а не сядзеў на сушы».

Сам родам з Украіны, Віталь Мікалаевіч упершыню пабываў у Беларусі ў 1964 годзе, калі ажаніўся (прыехаў знаёміцца з бацькамі жонкі), а на пастаяннае жыхарства перабраўся ў 1976-м. Працаваў у Камянкоўскім сельскім Савеце, ваенруком у школе, а потым займаўся хатняй гаспадаркай — сапраўдны марак, тым больш падводнік, можа ўсё. І з тэхнікай ён «на ты».

Раней вёска Суткі была значна большай, але пасля таго, як падчас вайны яе спалілі, у мінулых маштабах аднавіцца не змагала. Нават Сутка́ўскую сярэднюю школу перанеслі ў суседнюю вёску Гарадок. Цяпер тут толькі 21 жылы дом, пастаянна пражываюць 16 сем'яў, у асноўным пенсіянеры. Старыя паміраюць, моладзь у вёсцы не застаецца.

У Віталя Мікалаевіча добра атрымліваецца арганізаваць аднавяскоўцаў, агульнымі намаганнямі правесці суботнік, адзначыць Свята вёскі, і ў любой працы ён першы — асабістым прыкладам заахвочвае суседзяў.

Пенсіянер прызнаўся, што старэйшынай быць няпроста нават яму, былому ваеннаму. «Я столькі ворагаў нажыў, — падзяліўся падводнік. — Адзін п'е моцна, не прасыхае. Скажы яму што-небудзь — на дыбкі становіцца. Розныя людзі бываюць, як у любой сям'і, а тым больш — у вёсцы. Самае складанае, што правоў ты ніякіх не маеш, цяжка бывае паўплываць на асобных людзей. Скажам, ёсць у нас непрапісаны перасяленец, які адмаўляецца плаціць за вываз смецця, сабак навязваць. А калі я звярнуўся да ўчастковага — крыўдаваць на мяне пачаў. Я вінаватым застаўся».

З будучай жонкай Доняй Вікенцьеўнай пазнаёміўся падчас службы на флоце, дзе яна працавала кухарам. Літаральна праз месяц прапанаваў ажаніцца. «Не было калі заляцацца, — тлумачыць гаспадар. — Я зразумеў, што яна будзе вернай жонкай, таму і ўзяў». У Віталя Мікалаевіча і Доні Вікенц'еўны 2 дзяцей, 8 унукаў, 2 праўнукі — і трэці «на падыходзе».

Галоўнай умовай адраджэння вёскі Віталь Мікалаевіч лічыць павышэнне заробку сялянам: «Калі б людзям плацілі больш, тады і ўсе дамкі ў аграгарадках былі б заселеныя».

...Ядвіга Юльянаўна РУБАШНАЯ — старэйшына вёскі Глінкі Камянкоўскага сельсавета. Нарадзілася ў вайну, у гэтай жа вёсцы, была трэцім дзіцем у сям'і. Скончыла 7 класаў. Працавала паляводам, пэўны час завіхалася на свінаферме, на складзе, потым зноў вярнулася ў паляводы. Заўсёды была ў спісе найлепшых працаўнікоў, рэгулярна ездзіла на злёты перадавікоў, была актывісткай прафсаюзнай арганізацыі, дэпутатам мясцовых Саветаў. З будучым мужам, Яўгенам Станіслававічам, пазнаёмілася, калі той прыйшоў з арміі. Днямі Рубашныя адзначылі 46 гадоў з дня вяселля.

— Вёска ў нас вялікая, але жыхароў засталося няшмат. У асноўным старыя людзі, мала маладых, — расказвае пра сваю маленькую радзіму старэйшына. — Усяго чалавек 120, плюс з два дзясяткі дачнікаў. Людзі да мяне прыходзяць з рознымі пытаннямі. Каму дровы прывезці, каму саломы. Праблем шмат, не ўсе, бывае, і вырашыш. Галоўнае — каб быў які транспарт, а калі транспарту няма... Агульнымі намаганнямі ўпарадкуем могілкі — людзі скідваюцца на вываз смецця, на фарбу для агароджы. Нашы вяскоўцы і самі паўдзельнічалі б у навядзенні парадку, але шмат каму ўжо больш за 80 гадоў, ім хадзіць цяжка. Мы з мужам едзем на могілкі і прыбіраем там вясною. Ён з касой пройдзе, потым разам грабём, вывозім.

Калі, бывае, смецце па вёсцы не забяруць (трактар заняты ў іншым месцы ці сапсаваўся), я прашу свайго мужа: «З'ездзі забяры, каб на вуліцы смецце не стаяла». Ён бярэ наш трактар і вывозіць смецце. Галоўнае, каб была салярка. Па яе трэба ажно ва Узду ехаць, а машыны ў нас няма. Тады просім кагосьці купіць. Увогуле, якую работу зрабіць зможам — заўсёды дапаможам... Я без працы жыць не магу. За працай я ажываю. Вельмі люблю гатаваць. Гэта можна назваць маім хобі. У нас такія ўсе ў родзе. Я кожны дзень нешта гатую — і суп, і да супу, хаця б яечню з салам ды блінцамі.

Радуе старэйшыну тое, што апошнім часам вясковая моладзь пачала больш клапаціцца пра добраўпарадкаванне — па вясне ўсе дружна фарбуюць дамы, рамантуюць агароджы, наводзяць парадак. «Я на пачатку года праходжу па вуліцы і кожнаму гавару, дзе і што яму трэба ўпарадкаваць на сваім участку, каб усюды было чыста і прыгожа». У самой Ядвігі Юльянаўны на двары заўсёды ўзорная чысціня і парадак. Туды можна экскурсіі вадзіць — паказваць, што значыць быць гаспадарамі.

**Інга МІНДАЛЁВА.**
**Фота Паўла ПРАХАРЭНКІ.**

*Уздзенскі раён.*



Ядвіга і Яўген РУБАШНЫЯ.

# ХТО СПІЛІЦЬ ДРЭВА?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На Аршаншчыне старэйшыны, распавядаючы аб праблемах вёскі, часцей за ўсё гавораць пра вялізныя старыя дрэвы з тоўстымі ствaламі, якія немагчыма спілаваць нават грамадой. Гэтыя дрэвы могуць у любы час упасці ад магчымага ветру і пашкодзіць пабудовы на падворках вяскоўцаў.

У кожнай вёсцы ёсць такія «экзэмпляры». Калі дрэва знаходзіцца на двары гаспадара, тады лічыцца яго ўласнасцю, і пілаваць яго трэба за свае сродкі. Шмат старых дрэў і на грамадскай тэрыторыі. Але аб тым, як прыбраць іх, думае ўжо старшыня Савета.

У вёсцы Анібалева, напрыклад, дом, які належыць сельгаспрадпрыемству, пакінулі жыльцы, бо магутныя дрэвы пагражаюць абрушыцца на дах. Калі гэта не ўласная хата, дык, напэўна, няцяжка было з'ехаць адсюль і знайсці бяспечнае жытло. А калі хата пабудаваная сваімі рукамі ці на свае грошы, так проста яе не кінеш, а будзеш шукаць варыянты, як пазбавіцца ад небяспечнага дрэва.

Калі з дрэвам не пад сілу справіцца гаспадару і нават вясковай грамадзе, людзі звяртаюцца па дапамогу ў раённую камунальную гаспадарку ці Аршанскі гарадскі аддзел па надзвычайных сітуацыях. Напрыклад, у вёсцы Клюшнікава жыхарка Соф'я Мацюшава на працягу года тэлефануе і піша заяўкі ў аддзел па надзвычайных сітуацыях, каб спілавалі вялізнае старое дрэва каля яе хаты. Прычым жанчына згодна за гэта заплаціць. Яна ведае, што з кішэні неабходна выкласці не менш за 250 тысяч рублёў, а можа, і больш. Ды чаканне зацягнулася. У лістападзе яна зноў тэлефанавала: калі ж нарэшце прыедуць і зробяць гэту работу?

Старэйшына вёскі Клюшнікава Рыгор Сафрановіч пацвердзіў, што дрэва ля хаты Мацюшавай трэба спілаваць. Яно выбракавана інспекцыяй па ахове прыроды і ўяўляе небяспеку: можа паваліцца і парушыць хату ці хлеў. Так ужо было ў двух жыхароў вёскі: сёлета ў час лівневых дажджоў і моцнага ветру паваліла старыя дрэвы на дахі жылых дамоў. Людзі пацярпелі матэрыяльна, бо трэба было рамантаваць жытло. А будаўнічыя матэрыялы, як вядома, нятанныя.

У старэйшыны каля хаты таксама расло такое дрэва. Але ён паспеў яго прыбраць пры дапамозе ўсё той жа службы з аддзела па надзвычайных сітуацыях. Плаціў за ўборку дрэва са сваёй кішэні. Праўда, тады спілаваць дрэва і прыбраць яго з двара каштавала ўсяго 180 тысяч рублёў.

Калі гэта платная паслуга і на ёй можна зарабіць, дык чаму ж марудзяць з уборкай у вёсках старых дрэў? З гэтым пытаннем я звярнулася ў Аршанскі аддзел па надзвычайных сітуацыях да намесніка начальніка па аператыўнай рабоце Сяргея Яўсеева.

Ён удакладніў, што заказаў на тое, каб спілаваць старыя дрэвы, у вёсках раёна сапраўды шмат. Па кожным сельсавеце ёсць заяўкі. Напрыклад, у Высоцкім сельсавеце — восем такіх дрэў, Панізоўскім — дзесяць, Задроўеўскім — сем, і гэтак далей. Ды і прыватных заказаў каля 25. Усяго сто зваротаў набярэцца па гэтай «тэме».

Сяргей Іванавіч адразу агаварыў, што такія паслугі не ўваходзяць у абавязкі супрацоўнікаў аддзела па надзвычайных сітуацыях, але выконваць іх яны вымушаны, бо пакуль няма каму гэта рабіць.

А марудзяць з гэтай справай, таму што недастаткова тэхнікі для падобных заказаў. Ёсць у наяўнасці толькі адзін 32-метровы пад'ёмнік, які цяпер на рамонце ў Віцебску. Пад'ёмнік важыць сорак тон і па вясковых дарогах восенню і вясной прайсці не можа — вязне. Таму і затрымліваюцца з уборкай дрэва ў Клюшнікаве, бо туды можна пад'ехаць толькі «па марозе».

— Каб своечасова прыбраць старыя дрэвы ў вёсках, трэба набыць яшчэ адзін пад'ёмнік, меншай магутнасцю (на 18 метраў). У яго і праходнасць па вясковых дарогах лепшая, і затраты паліва меншыя. Аптымальны ж варыянт — каб брыгада з пад'ёмнікам мелася ў складзе КУП «Райжылфонд», дзе абавязаны выконваць такія функцыі па абслугоўванні вясковага насельніцтва. А супрацоўнікі аддзела па надзвычайных сітуацыях выконвалі б свае функцыі — своечасова апыналіся там, дзе ёсць пагроза здароўю і жыццю грамадзян.

Сяргей Яўсееў прывёў у прыклад горад Оршу, дзе функцыянуе прадпрыемства «Арыён» (займаецца добраўпарадкаваннем горада). Там маюць неабходныя машыны і механізмы, таму не ўзнікае праблемаў з тым, каб аказаць платную паслугу жыхару горада ці арганізацыі па ўборцы дрэў.

Калі ж я спытала ў кіраўніцтва КУП «Райжылфонд», ці могуць яны ў перспектыве аказваць такія паслугі, галоўны інжынер Аляксандр Каўрыга адказаў:

— Для выбракоўвання і пілавання дрэў у населеных пунктах наша прадпрыемства не мае матэрыяльнай базы і кваліфікаваных работнікаў. У нас няма пад'ёмнікаў і не хапае грошай, каб набыць дарагую тэхніку. А калі б яна і была, то ў штаце няма навучаных людзей, якія б умелі дзейнічаць у экстрэмальных умовах: дрэва каля хаты трэба спілаваць так, каб не пашкодзіць пабудовы і не стварыць небяспеку для жыхароў. Атрымліваецца, што аддзел па надзвычайных сітуацыях найбольш падыходзіць для такой дзейнасці. Няхай бы ўсё так і заставалася, толькі на законных падставах. Тады б ім і тэхніку дадатковую выдзелілі б.

...Так што няхай жыхары вёсак яшчэ пачакаюць.

**Вольга ШУТАВА.**

# НА БРЭСТЧЫНЕ АДСВЯТКАВАЛІ 70-ГОДДЗЕ

**Юбілей вобласці адзначылі вялікім мерапрыемствам у спартыўным комплексе «Вікторыя». Напачатку ганаровы грамадзянін Брэсцкай вобласці старшыня праўлення Нацбанка краіны Пётр Пракаповіч зачытаў прывітальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і ўручыў ад імя кіраўніка дзяржавы Ганаровы дзяржаўны сцяг, якім узнагароджана вобласць.**

Да слова сказаць, гэта другая ўзнагарода рэгіёна, ордэна Леніна вобласць была ўдастоена за дасягненні двух пасляваенных дзесяцігоддзяў.

На свята прыехала шмат гасцей, у тым ліку былыя кіраўнікі вобласці. Цяперашні яе кіраўнік старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар у сваёй прамове адзначыў, што гісторыя складваецца з падзей, але пішуць яе людзі найперш сваёй самаадданай працай. На свяце і ўшанавалі самых заслужаных людзей. Тым, каму напярэдадні сесія аблсавета надала званне ганаровага грамадзяніна вобласці, уручылі дакументы і памятныя стужкі. Яшчэ раз прагучалі імёны знакамітых людзей берасцейскага краю, тых, чый унёсак у біяграфію вобласці найбольш значны.

Прадоўжыў свята грандыёзны канцэрт пад рэжысурай народнага артыста рэспублікі Анатоля Вараб'ёва. Мерапрыемства, як і было задумана, прадэманстравала культурны і творчы патэнцыял вобласці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «СЯДЗЯЧАЯ» ПРАЦА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Апошнім часам на гутарку ўсё часцей прыходзяць прэтэндэнткі ва ўзросце «каля пяцідзесяці», з якімі на ранейшым працоўным месцы не захацелі перазаключаць кантракт. І гэта трывожная тэндэнцыя — калі разумная, адукаваная жанчына «ў росквіце» вымушаная ісці на такую працу, лічыць Вольга Камісарава. «Хлеб» сядзелкі нялёгкі, тым больш калі даводзіцца даглядаць хворага пасля інсульту або з цяжкай анкалогіяй.

— Уяўляеце, яна падыходзіць да чалавека, каб пакарміць, памяняць памперс, а ён ужо нежывы... Псіхалагічна гэта цяжка вытрымаць. Тэлефануе мне: усё, я больш не магу ў вас працаваць. На маёй памяці два такія выпадкі былі.

Сёння, па словах супрацоўнікаў цэнтра, усталяваўся пэўны баланс паміж «штатам» сядзелак і колькасцю кліентаў, якія карыстаюцца іх паслугамі. На гэты момант з цэнтрам на падставе дагавораў супрацоўнічае 37 сядзелак з усіх раёнаў сталіцы. Гэта зроблена для зручнасці — каб кожная мела магчымасць абслугоўваць людзей менавіта ў сваім раёне, па месцы жыхарства, не расходуючы дадатковы час на пераезд з аднаго канца горада ў іншы.

Дарэчы, праца сядзелкі не ўключае ў сябе правядзенне медыцынскіх працэдур (уколы, кропельніцы, масаж, апрацоўка пролежняў і да т.п.), і гэта адразу агаворваецца з кліентам. Тэрытарыяльны цэнтр не будзе заключаць дагавор на паслугі і ў тых выпадках, калі патэнцыйны кліент псіхічна хворы або ў яго выяўлены туберкулёз.

— А хіба вашы заказчыкі не спрабуюць «схаваць» такія факты? — цікаўлюся ў Камісаравай.

— Натуральна, спрабуюць. Але безвынікова. У працэсе гутаркі я задаю патэнцыйнаму кліенту шмат пытанняў, адказваючы на якія, ён міжволі выдае ўсю неабходную нам інфармацыю. Мы не маем ніякага права падвяргаць небяспецы жыццё сваіх супрацоўнікаў.

У 2008 годзе ў службу сядзелак Першамайскага раёна звярнулася 17 жыхароў сталіцы, сёлета ўжо больш за 70. Прычым, карыстацца іх паслугамі можна не толькі дома, але і ў медыцынскіх установах. Бальніцы вельмі спрыяльна ставяцца да гэтага і ідуць людзям насустрач — малодшага медыцынскага персаналу там па-ранейшаму не хапае, а сядзелка, запрошаная да таго ці іншага пацыента, хоць у некаторай ступені змяншае гэта напружанне.

— Сёння далёка не ўсе жыхары сталіцы ведаюць пра існаванне дзяржаўнай службы сядзелак, — гаворыць дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна Алена Філімонава. — Мы спрабуем рабіць усё, што ў нашых сілах, для інфармавання грамадзян, але без дадатковага фінансавання дзяржаўнай установе цяжка «раскруціць» сваё дзецішча.

Дарэчы, у чэрвені гэтага года інфармацыя аб існаванні дзяржаўнай службы сядзелак «прайшла» праз жыроўкі жыхароў раёна, у планах цэнтра — распаўсюдзіць яе ў цырульнях, лазнях і іншых грамадскіх месцах, дзе за дзень «пераварочваецца» вялікая колькасць людзей. «Пра нас неабходна заяўляць!» — упэўнены супрацоўнікі цэнтра. Яны лічаць, што нават пры тых невысокіх тарыфах, якія існуюць сёння, можна дасягнуць павелічэння заробкаў сядзелак — пры ўмове росту колькасці кліентаў і пашырэння пераліку паслуг.

— Ведаеце, калі да гэтага часу ў сталіцы не вырашана пытанне з адкрыццём спецыялізаванай установы па аказанні медыка-сацыяльнай дапамогі хворым і іх сваякам, то гэту функцыю ў нейкай меры могуць узяць на сябе тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання, стварыўшы службы сядзелак, — сказала на развітанне Вольга Камісарава. — Такіх цэнтраў у Мінску 9, і калі кожны заявіць аб сабе ў гэтым плане, атрымаецца магутная дапамога. Тут не можа быць размовы аб нейкай канкурэнцыі, наша асноўная задача — дапамагаць людзям.

**Наталля КАРПЕНКА.**

**P.S.** ***Жыхары сталіцы, якім патрэбна дапамога сядзелкі, могуць звяртацца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання Першамайскага раёна па тэлефоне 280 33 85.***

## ДЗЯКУЙ!

# ЯК І ТРЭБА БЫЛО ЧАКАЦЬ

Штогод каля 12 тысяч інвалідаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і асобаў, да іх прыроўненых, папраўляюць сваё здароўе ў шпіталі, які носіць імя Пятра Міронавіча Машэрава. Размешчана гэта ўстанова (кіруе ёй выдатнік аховы здароўя, урач вышэйшай катэгорыі Інэса Браніславаўна Масла) непадалёк ад Мінска ў сасновым лесе, аснашчана па апошнім слове медыцынскай тэхнікі і працуюць там цудоўныя спецыялісты.

Як былы пацыент хачу шчыра падзякаваць загадчыцы тэрапеўтычнага аддзялення № 5 Але Міхайлаўне Молчан, свайму лечачаму ўрачу Дзіяне Дзмітрыеўне Варапай, медыцынскім сёстрам Вользе Міхайлаўне Жукавай, Ліліі Рурыкаўне Шуман, Алене Анатольеўне Вінікоўскай, Жанне Васільеўне Капітонец. Лічу, што іх увага, іх клопат, іх добрыя словы спрыяюць хворым не менш, чым лекі.

З павагай ставяцца ў шпіталі і да працы культарганізатара Таццяны Міхайлаўны Падкаваевай. Яна ладзіць канцэрты і іншыя мерапрыемствы, сярод хворых лёгка знаходзіць таленты...

Іншымі словамі, пасля курсу лячэння ў гэтай установе маё самаадчуванне, як і трэба было чакаць, стала значна лепшым.

**Георгій ПАПКОЎ,** *г. Беразіно.*


**РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ВИТЕБСКМЕБЕЛЬ»**

